УДК 343.95

# КАНСТЫТУЦЫЯ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ – ВАЖНЕЙШЫ ГІСТАРЫЧНЫ ЭТАП У РАЗВІЦЦІ І СТАНАЎЛЕННІ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ І КАНСТЫТУЦЫЙНАГА ПРАВА

**Молчан Андрэй Васільевіч,**
ДУА «Лапіцкая сярэдняя школа»
(Магілёўская вобласць, Асіповіцкі раён, а/г Лапічы, Рэспубліка Беларусь)

*Даклад паведамляе пра адзін з гісторыка-прававых этапаў развіцця беларускай дзяржаўнасці і канстытуцыйнага права – перыяд Рэчы Паспалітай і яе Канстытуцыю 3 мая 1791 г., даецца гісторыка-прававая адзнака і значэнне Канстытуцыі.*

Беларусь, як і многія краіны свету, прайшла шмат этапаў свайго развіцця перад тым, як стаць сучаснай Незалежнай Рэспублікай. Адным з такіх найважнейшых гістарычных этапаў у станаўленні і развіцці беларускай дзяржаўнасці зяўляецца перыяд Рэчы Паспалітай.

Рэч Паспалітая – адна з буйнейшых краін Еўропы, якая праіснавала з моманту падпісання Люблінскай уніі ў 1569 г. і да яе трэцяга падзелу 1795 г. З'яўлялася канфедэратыўнай дзяржавай, якая складалася з Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага.

Пасля шэрагу войн і паўстанняў, асабліва пасля вайны з Маскоўскай дзяржавай 1654–1667 гг., а таксама Паўночнай вайны 1700–1721 гг. Рэч Паспалітая страціла сваю былую магутнасць і веліч. Гэта яскрава праявілася ў 1772 г., калі яе пачалі дзяліць паміж сабой Расія, Аўстрыя і Прусія. Трэба было ратаваць дзяржаву і яе незалежнасць. Але існуючы дзяржаўны строй і палітычная сістэма толькі вялі да паглыблення крызісу. Таму абавязкова і тэрмінова неабходна было правесці рэформы. Але, каб праводзіць рэформы, неабходна было абмежаваць правы шляхты і ліквідаваць свавольства магнатаў, бо «вольнасці», якімі валодала шляхта ў той цяжкі час, перашкаджалі правядзенню рэформаў. На сеймах кожны шляхціц валодаў правам «Liberum veto», якое дазваляла забараніць любое рашэнне сейма кожнаму прысутнаму на ім шляхціцу. Такім чынам, зрываліся амаль усе сеймы, рашэнні якіх павінны былі ўзмацніць дзяржаву. Такая сітуацыя больш за ўсё задавальняла Расію і іншыя суседнія дзяржавы, якія жадалі бачыць Рэч Паспалітую слабай, бо прэтэндавалі на яе землі. Расія ў той час пастаянна ўмешвалася ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай, спрыяла зрыву сеймаў і стварэнню розных палітычных груповак.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Напрыканцы 80-х гг. XVIII ст. склаліся вельмі зручныя ўмовы на міжнароднай арэне, якія б дазволілі самастойна, без знешняга ўмяшальніцтва з боку Расіі ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай правесці неабходныя рэформы. У 1778 г. Расія і Аўстрыя пачалі вайну з Турцыяй. Супраць Расіі таксама выступіла і Швецыя. Акрамя гэтага, супраць Расіі таксама была створана кааліцыя, якая складалася з Прусіі, Англіі і Галандыі. Такім чынам, былыя паплечнікі адносна пытання аслаблення і падзелу Рэчы Паспалітай пасварыліся.

У 1788–1792 гг. удалося правесці сейм, на якім былі прынятыя вельмі важныя рашэнні для захавання незалежнасці Рэчы Паспалітай. Падчас яго правядзення не дзейнічаў прынцып «Liberum veto», а рашэнні прымаліся большасцю галасоў. Гэта стала магчыма дзякуючы таму, што сейм арганізоўваўся як канфедэрацыя. Найважнейшым вынікам сейма, які празвалі «Вялікі», было прыняцце Канстытуцыі 3 мая 1791 г. Яна павінна была стаць асноўным і галоўным Законам Рэчы Паспалітай, замацоўваючы тым самым сваю незалежнасць, грамадска-палітычны лад.

Канстытуцыя Рэчы Паспалітай складалася з некалькіх частак: прэамбулы і 11 раздзелаў. Пачыналася Канстытуцыя з такіх слоў: «Прызнаючы тое, што лёс усіх нас залежыць толькі ад узмацнення і дасканаласці Нацыянальнай Канстытуцыі, спазнаўшы на доўгім вопыце недахоп нашага ўрада <…>, вольныя ад загадаў ганебнага іншаземнага гвалту, шануючы даражэй жыцця <…> знешнюю незалежнасць і ўнутраную свабоду Народа, лёс якога даручаны ў нашы рукі <…>, мы прымаем гэту Канстытуцыю» [7, с. 157].

Першы раздзел Канстытуцыі паведамляў, што пануючай рэлігіяй у краіне з'яўляецца каталіцкая царква, але ў той жа момант сцвярджалася, што іншым рэлігійным канфесіям «гарантавалася свабода выканання рэлігійных абрадаў» [1, с. 103].

Другі раздзел змяшчаў пацвярджэнне ўсіх правоў польскай і вялікакняжацкай шляхты (ВКЛ).

Трэці раздзел змяшчаў і замацоўваў Закон «Аб гарадах», згодна з якім усе гарады на тэрыторыі Рэчы Паспалітай прызнаваліся вольнымі.

У чацвёртым раздзеле гаварылася пра сялян. І хоць гэта была спроба пэўным чынам абмежаваць свавольствы паноў да іх, свабоды сялянам Канстытуцыя не давала. Яны так і заставаліся прыгоннымі. Ва ўмовах стварэння і развіцця буржуазна-капіталістычных адносін наяўнасць прыгоннага права тармазіла эканамічнае развіццё Рэчы Паспалітай.

Пяты раздзел замацоўваў падзел улады на тры галіны: заканадаўчую, выканаўчую і судовую. Раздзел таксама паведамляў пра тое, што «ўсякая ўлада ў чалавечым грамадстве бярэ свой пачатак з волі народа» [1, с. 103]. Прынцыпы гэтага раздзела ў той ці іншай форме адлюстраваны ў многіх сучасных Канстытуцыях свету, у тым ліку і ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У шостым раздзеле гаварылася пра структуру і паўнамоцтвы заканадаўчай улады, якая ўяўляла сабой двухпалатны Сойм. Таксама адмянялася права «Liberum veto».

Сёмы раздзел вызначаў структуру, правы і абавязкі ўрада – выканаўчай галіны ўлады, які меў назву Стража правоў. Кароль цяпер павінен быў уваходзіць у склад урада.

Восьмы раздзел замацоўваў структуру і паўнамоцтвы органаў судовай улады. Яны не зусім адпавядалі ў гэтым пытанні Статуту Вялікага Княства Літоўскага 1588 г. Таму, з гэтай прычыны, планавалася ўнесці папраўкі ў Статут.

Дзявяты і дзясяты раздзелы датычыліся караля, а менавіта пытанняў, звязаных з рэгенцтвам і выхаваннем яго дзяцей.

Адзінаццаты раздзел вядзе размову пра войска Рэчы Паспалітай. Згодна з Канстытуцыяй новае войска складалася з шляхты і сялян. Войска павінна было падпарадкоўвацца ўраду і прысягала народу і каралю, абараняла Рэч Паспалітую і яе Канстытуцыю.

Першая Канстытуцыя ў свеце была створана ў Злучаных Штатах Амерыкі. Але першая ў Еўропе – Канстытуцыя Рэчы Паспалітай, дзяржавы, якая складалася з Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага, гістарычнай спадчыны беларускага народа. ВКЛ, у сваю чаргу, з'яўлялася найважнейшым этапам у гісторыі развіцця і станаўлення беларускай дзяржаўнасці. Канстытуцыя Рэчы Паспалітай вызначала межы дзяржаўнай улады і яе паўнамоцтвы. Улада дзялілася на тры галіны. Наяўнасць адзінага ўрада (як выканаўчай галіны) павінна была ператварыць дзяржаву з канфедэрацыі ў федэрацыю, што павінна было б цэнтралізаваць і ўзмацніць цэнтральную ўладу, абмежаваўшы тым самым свавольства магнатаў. Канстытуцыя 1791 г. павінна была захаваць незалежнасць Рэчы Паспалітай. Але, на жаль, мэта яе так і не была дасягнута. Расія памірылася з еўрапейскімі дзяржавамі і пачала далей ліквідаваць Рэч Паспалітую як дзяржаву, стварыўшы прарасійскую Таргавіцкую канфэдэрацыю, з дапамогай якой ажыццявіла другі падзел у 1793 г. За ім успыхнула паўстанне 1794 г. пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі, што змагло б выратаваць цэласнасць і незалежнасць Рэчы Паспалітай. Але і гэта спроба не ўдалася. Таму ў выніку трэцяга падзелу 1795 г. Рэч Паспалітая перастала існаваць як дзяржава, а беларускія землі былі далучаны да Расіі. Канстытуцыйныя акты, а потым і Статут ВКЛ 1588 г. былі заменены на заканадаўчыя акты Расійскай імперыі.

Нягледзячы на тое што Канстытуцыя Рэчы Паспалітай 3 мая 1791 г. не змагла дасягнуць сваёй мэты і не захавала дзяржаву, трэба адзначыць, што яна зрабіла вялікі ўнёсак не толькі ў развіццё і станаўленне беларускай дзяржаўнасці, але і канстытуцыйнага права.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Спіс крыніц**

1. Васілевіч, Р. А. Гісторыя канстытуцыйнага права Беларусі / Р. А. Васілевіч, Т. І. Доўнар, І. А. Юхо. – Мінск, 2001. – 362 с.

2. Гістарычны шлях беларускай нацыі і дзяржавы / М. Біч [і інш.]. – 2-е выд., дап. – Мінск : З. Колас, 2005. – 432 с.

3. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / Ю. Бохан [і інш.] ; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн. : Экаперспектыва, 2004. – Т. 3 : Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стст.). – 344 с. : іл.

4. Дмитрук, Е. П. Речь Посполитая: проблема осмысления названия государства с помощью историко-юридического анализа (на примере конституционных актов XVI–XVIII веков) / Е. П. Дмитрук // Право.by. – 2013. – № 4. – С. 5–9.

5. Konstytucja 3 maja 1791 / [wprowadzenie naukowe Juliuaz Bardach]. – Warszawa : Wydawnictwo Sejmowe, 2001. – 229 c.

6. Нарыс гісторыі Польскай Дзяржавы і Народа. X–XXI ст. / рэдакцыя і ўкладанне тэксту: Мар'ян Семаковіч. Пераклад тэксту з польскай: Ганна Цішук. Варшава: Demart, 2005. – 312 с.

7. Polskie dzieje od czasów najdawniejszych do współczesności / Alicja Dybkowska, Jan Żaryn, Małgorzata Żaryn. – Warszawa : Wydawnictwo Naukowe PWN, Warszawa, 1994. – 378 c.

8. Чудаков, М. Ф. Конституция Речи Посполитой 3 мая 1791 года: государственно-правовая характеристика / М. Ф. Чудаков. – Минск : Академия управления при Президенте Республики Беларусь, 2005. – 36 с.

9. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭН, 1997. – Т. 4 : Кадэты – Ляшчэня. – 432 с.

10. Юхо, Я. А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі / Я. А. Юхо. – Мінск : Універсітэцкае, 1992. – 270 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова